УДК 821.161.3.09 “19” – 1

**ПАЭТЫЧНАЕ МАЙСТЭРСТВА ЗОСЬКІ ВЕРАС**

**Фешчанка Маргарыта Аляксандраўна**
**ДУА «Навадворская сярэдняя школа Мінскага раёна»**

**THE POETICAL SKILLS OF ZOSKA VERAS**

**Feshchanka Marharyta, marachvie@gmail.com**
**State Educational Institution «Novy Dvor School»**

**Анатацыя.** У артыкуле разглядаецца лірычная спадчына Зоські Верас, яе патрыятычная і інтымная лірыка, вобразна-сімвалічная сістэма паэзіі, а таксама роля роднай песні, прыродных вобразаў і сэрца як цэнтра пачуццяў.

**Ключавыя словы:** Зоська Верас, беларуская паэзія, інтымная лірыка, патрыятычная лірыка, пейзажная лірыка, вобраз песні, вобраз сэрца.

**Abstract.** The article examines the lyrical heritage of Zoska Veras, her patriotic and intimate lyrics, the figurative-symbolic system of poetry, as well as the role of native song, natural images, and the heart as the center of feelings.

**Keywords:** Zoska Veras, Belarusian poetry, intimate lyrics, patriotic lyrics, natural lyrics, image of song, image of heart.

Зоська Верас (Людвіка Антонаўна Сівіцкая-Война) – беларуская паэтэса, вядомая не толькі сваёй літаратурнай дзейнасцю. Яна выдавец, перакладчыца, мемуарыстка, актыўная грамадская дзеячка, а таксама бортніца. Большасць даследчыкаў ведае і шануе яе за яе ўклад у грамадства і напісанне мемуараў пра такіх выбітных асоб беларускай культуры, як Максім Багдановіч, Ядвігін Ш., Змітрок Бядуля, Фабіян Шантыр і інш. Імя Зоські Верас было вядомым сярод такіх беларускіх класікаў, як Рыгор Барадулін і Уладзімір Караткевіч.

Але яе літаратурная дзейнасць не так шырока распаўсюджана, як грамадская. Не дзіва, чаму так сталася – было выдадзена ўсяго каля 20 вершаў Зоські Верас, у той час як у яе нататніках налічваецца больш за 50 рукапісных вершаў [1]. Гэтыя нататнікі знаходзяцца ў Літаратурным музеі Максіма Багдановіча, таму большасці вершаў паэтэсы не атрымалі шырокага распаўсюджання. Але яе вершы нясуць у сабе важную культурную вартасць: яе вершы мілагучныя, захавалі ў сабе беларускае вымаўленне асіміляцыйнай мяккасці і ўплыў паланізмаў, адметныя сваёй жанравай разнастайнасцю.

У сваёй патрыятычнай лірыцы Зоська Верас захоўвала нацыянальную самасвядомасць. Нават статус «дваранкі», які тады абумоўліваў польскамоўнасць, не спыніў паэтэсу ад актыўнага ўжывання роднай мовы, вывучэння беларускай культуры і працы на карысць Радзімы.

Не апошнюю ролю ў вершах Зоські Верас іграе вобраз роднай песні. Уплыў актыўнай грамадскай дзейнасці і вывучэнне беларускай творчасці відавочны: «Хорам годным, тонам жывым // Песня родная плыві! // Паддай сілы тым, што ўсталі // Душы спячых прабудзі» [2, с. 40]. Для паэтэсы важна існаванне ў яе жыцці і ў жыцці народа беларускага слова: яно дае сілы, матывуе, з’яўляецца крыніцай моцнай свядомасці, з’яўляецца адначасова і прычынай, і мэтай дзейнасці ўсёй беларускай інтэлегенцыі: «Гэй ляці ты наша песня // як шырокі край! // Сілай сваіх дзіўных чараў // на сэрцах іграй» [2, с. 40], «Люблю жалейкі песьні сумны // Як па начной расе пальюцца» [2, с. 11].

Але родная песня для паэтэсы гэта не толькі ўвасабленне беларускага слова, але і неад’емная частка душы: «Вясну ўжэ чуе мая душа раздольна // І песьню надзеі ціхенька пяе» [3]. Для паэтэсы песня льецца нават з вуснаў прыроды: «То зноў высокі цёмны лес сасновы // пакрые бераг круты // Яго песьняю… сумам, сумам ціхіх вячысты // чэлавечэ не нацешысься ты…» [2].

Вядома, родная зямля выклікае не толькі пазітыўныя ўспаміны: Беларусі прыйшлося прайсці праз страшэнныя выбраванні гісторыі, якія пакінулі пасля сябе крывавы след. І гаворка ідзе не толькі пра Першую сусветную вайну. Зоська Верас у сваіх творах часта выказвае сваю любоў і боль да родных мясцін, роднай краіны і яе трагічнага лёсу: «Толькі мне ця жаль, // Край родны! // Ты нешчасны… Ты галодны… // дзе, што ступіш, адно гора… // дзе сьлёз горкіх цэла морэ… // Толькі мне ця жаль…» [2].

Доўгія ад’езды ад роднай старонкі таксама негатыўна ўплывалі на эмацыйны стан паэтэсы, лірычная гераіня сумуе па сваёй Радзіме, жадае вярнуць гэты грунтоўны, значны кавалак сваёй душы сабе: «Гдзе ж гэта хата, пакрытая мохам, // Што мене гадавала? // Гдзе ж гэта яблынька з лістом зялёным, // Што ў садзе стаяла?» [2], «Хацела да Це напісаці // на лісточку кветкі пахучай, // але ж лісточак мог згінуць // ў пору буры грымучай…» [2].

Зоська Верас любіць свой родны дом: «На ад’езьдзінах з роднай я хаты, // пазагнаўшы загон шэры свой // ўзяў ў дарогу скарб вельмі багаты, // скарб, пасьвенчаны Маткай-Зямлёй» [3]. Павагу і любоў да родных мясцін Зоська Верас змагла адзначыць простым прыёмам – напісала «Маткай-Зямлёй» з вялікай літары. Можна сказаць, што тут прысутнічаюць пэўныя хрысціянскія матывы, бо для лірычнага героя родная Зямля – гэта святое. Агулам любоў да краіны ў ёй спарадзіла менавіта гэтая любоў да маленькіх рэчаў, розных частак яе Бацькаўшчыны: «Люблю я у небе месяц, зоркі. // Што люблю больш! Недалічыш, // Бо я люблю усю зямельку // І весь край мой родны // Беларусь!...» [2].

Паэтэса працавітая, актыўная, што бачна з яе біяграфіі і вялікага ўкладу ў грамадства. У яе да самых апошніх дзён былі сілы на новую дзейнасць, вучобу, кантакты з людзьмі. І ўсё гэта не дзеля сябе, а для служэння Радзіме: «З сілай, энэргіяй, што будзіць ў душах // яснае, магутнае сонцэ, // выйдзьмо з плугамі мы на папары, // у роднай нашай старонцэ…» [2]. Зоська Верас не толькі сама заматываваная на працу, але і матывуе іншых. Само неба натхняе яе працаваць на зямлі і дзеля зямлі.

У сваёй інтымнай лірыцы Зоська Верас ні раз звяртаецца да вобразу сэрца. Менавіта адтуль ідуць усе пачуцці, у тым ліку і пачуццё кахання. Пачуццё, якое складана кантраляваць: «Не бійся так моцна // У смучонай грудзі, // Не зрывай апошні сілы // Ён тваім не будзе…» [2], «Ты не вер! хоць казалі б вачэй тваіх сьлёзы, // хоцьбы з енкам балесным гаварыло сэрцэ…» [3].

Ужо вядома даўно, што сэрца – гэта душа. Менавіта там баліць, калі чалавек перажывае моцныя пачуцці: шчасце, гнеў, нуда, каханне… Лірычная гераіня Зоські Верас часта звяртаецца да вобразу сэрца, бо менавіта там сканцэнтраваны ўсе яе самыя глыбокія перажыванні, якія яна пакідае ўнутры сябе, не выстаўляючы на паказ, як і Зоська Верас доўга хавала большасць сваіх вершаў у сваіх нататніках.

Каханне для Зоські Верас – гэта не толькі шчасце і радасць. Часта гэта моцны боль: «Замкнецеся бедны вочы // Забіты сьлязамі // Годзі вам дарма глядзець // За яго сьлязамі… // Перэстаньце мае губы // Белыя ад смутку // Паўтараць яго імя // Кожную мінутку» [2]. Але нават так у душы лірычнай гераіні пануе надзея на шчаслівае каханне, на тое, што людзі памыляюцца і што аднойчы яна спазнае ўсю радасць гэтага пачуцця: «Хоцьбы людзі казалі, ах не вер ты ніколі, // што каханьне і шчасьце, то пустые гукі, // не вер, што жыцьцё нашэ і цёмно і сумно, // што душа чэлавека не спазнае долі… // Ты не вер! хоць казаліб вачэй тваіх сьлёзы, // хоцьбы з енкам балесным гаварыло сэрцэ… // хоць і вецер кусаў бы са стогнам і сьвістам… // хоць бы шэпатам-словам не сьціхалі лозы… // Хоць душабы ў магілу цярпеньня лягла // ты не вер хоцьбы гэто – і праўда была…» [3].

Для Зоські Верас каханне – пяшчотнае пачуццё спакою на душы, яднанне з другім чалавекам, магчымасць быць перад ім любой: моцнай ці слабой, гучнай ці ціхай, абы разам: «Пад вальца ледзь чутныя гукі // кружылі мы лёгка з табой… // пьяные хорам музыкі, // зямлі не крануўшы стапой… // Ты горача сціснуў мне руку, // ў адказ табе сціснула я… // забыўшы жыцьцёвую муку, // была радаснай думка мая…» [3].

З’яўленне пейзажных матываў у творчасці Зоські Верас не выпадкова, бо, варта адзначыць, Зоська Верас займалася пчалярствам і даглядала свой уласны сад. Пейзажныя матывы часта сустракаюцца ў яе творах, як у патрыятычнай лірыцы, так і ў інтымнай. Часта яна звязвае свае пачуцці, думкі з прыродай, надвор’ем і жывёламі.

У яе вершах часта сустракаецца слова вецер, які, на нашу думку, у яе творах сімвалізуе свабоду, імкненне да волі душэўнай і не толькі: «У маёй песьні вецяр плачэ…» [3], «Пашла бы я на край сьвета, // як той вецер, бура гэта, // што то гоніць чорны хмары // над даліны, над папары // ў цёмную даль…» [3]. Але вобраз ветру таксама можа выступаць антаганістам, выклікаць боль, як у радках, якія мы згадалі раней: «Ты не вер! хоць казаліб вачэй тваіх сьлёзы, // хоцьбы з енкам балесным гаварыло сэрцэ… // хоць і вецер кусаў бы са стогнам і сьвістам…» [3].

Душэўны стан лірычнай гераіні добра перадаецца цераз жывёл, птушак: «Ой не кукуй, зязюлька, у гару. // Гэй, гэй, зязюлька ў гару. // Ой не кажы, што я шчасце маю. // Гэй, гэй, шчасце маю. // Маё шчасце раненька вясною. // Гэй, гэй, раненька вясною. // Паплыло з бурліваю вадою. // Гэй, гэй, з бурліваю вадою. // Гдзе ты, шчасце маё?» [2]. У гэтых радках, на нашу думку, зязюля сімвалізуе час, хуткаплыннасць жыцця. Вясна сімвалізуе маладосць, якую змыла часам і вадою, у якой засталіся яе шчасце і каханне.

У вершах Зоські Верас часта пераважаюць песімістычныя настроі, асабліва ў ранняй творчасці, падчас Першай сусветнай вайны. І няхай з гадамі яе вершы сталі больш пазітыўнымі, адбітак ад гістарычных падзей і асабістых трагедый застаўся з ёй і ў яе вершах назаўсёды.

Вада, рэкі, мора могуць несці розныя значэнні: як сімвал жыцця, руху, так і сімвал слёз, смутку: «І ручаёчак я люблю // Што цечэ чысты па даліні // І казкі аб чужым краю // Шэпчэ чырвонай каліні» [2], «Ціхія, ясныя воды Нёмана // ідуць, плывуць у даль… // Махаюць каліны галіны зялёныя // ў халоднай пені іх хваль…» [3].

Восень, зіма, хмары – сімвал канца, жуды, нуды. Зоська Верас выкарыстоўвае гэтыя сімвалы і вобразы для перадачы душэўнага неспакою і суму лірычнай гераіні: «Забыць ня мае сілы. // І думка у ім адна // Блізкай зімы магілы, // Вярнісь, вярнісь, вясна…» [2]. Але зіма і снег таксама могуць несці даволі прыемны настрой. Зіма – час спакою, калі прырода мірна спіць, адпачывае пад белай коўдрай снегу. А белы колер надае атмасферу чысціні, новага пачатку, чыстага ліста, з якога можна пачаць наноў: «Сонца свеціць // там над намі, // Снег іскрыцца // пад нагамі, // Мароз цісне, // дакучае, // А наш Янка // і не дбае: // З гор на саначках // нясецца, – // Гараць вочкі // сэрца б’ецца»

[5], «Так ясна… так ціха… так бела // І усюды вялікі спакой // Зямля быццам зусім абамлела, // Не цешыцца яснай зарой…» [2]. Насмрэч, гэты верш можна ўспрымаць і з другога боку – як сумны летаргічны сон: «Лес цёмны, сасновы, вялікі // Маўчаў зачарован стаіць… // Не чутны вясёлыя клікі // І пташак хор, маўчыць…» [2].

Сонца, наадварот, з'яўляецца сімвалам надзеі, цеплыні, дабрыні, цесна звязанае з вясной. Напрыклад, у вершы «Сонейка грэе»: «І прыйшоў вось час жаданы: // Рады мы вясну сустрэць. // Просім сонца край каханы // Абудзіць і абагрэць» [5, с. 29]. Сонца – сімвал моцы. Яно дае жыццё прыродзе, дае людзям сілы працягваць.

Зялёны колер таксама з'яўляецца сімвалам жыцця ў многіх паэтаў, і творчасць Зоські Верас не выключэнне: «Люблю я поле луг зялёны // Дзе нашы конікі пасуцца» [2], «Гдзе ж гэта хата, пакрытая мохам, // Што мене гадавала? // Гдзе ж гэта яблынька з лістом зялёным, // Што ў садзе стаяла?» [2]. Расліны здаўна з'ўляліся сімваламі жыцця і здароўя. Мала таго, расліны сталі сімваламі цэлых народаў і краін. Немагчыма, гаворачы пра Беларусь, не згадваць пра каласы, васількі, лён. Для Зоські Верас гэта таксама так: «Гэта памятка з роднай Зямелькі, // яе сьлёзнай расою абліта. // Гэта беленькі цьвет канапелькі // і калосік даспелага жыта…» [3].

Як бы то ні было дзіўна, але ёсць пэўная частка прыроды, якая Зоську Верас не толькі засмучвае, але і пужае. Гэта сасновы лес на яе малой радзіме. Але нават пры ўсіх негатыўных пачуццях, якія перадае нам паэтэса праз сваю лірыку, яна ж потым зазначае, што любіць нават гэтую частку свайго дзяцінства: «Люблю я нават лес сасновы // Хоць у ім так страшна. Моцны Божа! // Які ж ён цёмны і вялікі // У нім чэлавек зблудзіці можэ!» [2], «То зноў высокі цёмны лес сасновы // пакрые берэг круты // Яго песьняю… сумам, сумам ціхіх вячысты // чэлавечэ не нацешысься ты…» [3].

Нескладана здагадацца, якая ўлюбёная пара года ў Зоські Верас – вясна, час росквіту прыроды, цеплыні, зялёнага колеру, час адлігі і вяртання да жыцця: «Забыць ня мае сілы. // І думка у ім адна // Блізкай зімы магілы, // Вярніcь, вярніcь, вясна…» [4]. Такое ж, па іроніі, і жыццё Зоські Верас – вясна і лета часоў актыўнай грамадскай дзейнасці змяніліся вайной, прынеслі восень у жыццё Зоські Верас. А потым і зіма – застой у яе творчай і грамадскай дзейнасці, жыццё ў якасці гаспадыні, маці і бабулі. Можна казаць, Зоська Верас прадказала сваё жыццё: «Грамадою, чэрадою, // Плылі думкі за табою, // От ясны светлы май… // Паўставалі летуценні // Заціхалі боль, цярпеньня // Прад вачыма – рай… // Зашумелі нудна лозы… // Паліліся дажджу сьлёзы // Восень надыйшла. // Душа сціхла, страпянулася // Скінуў чары, аглянулася // Раю не знайшла!..» [3, с. 14].

Такім чынам, творчая спадчына Зоські Верас, нягледзячы на яе недастатковае распаўсюджванне, з'яўляецца значным пластом беларускай паэзіі пачатку XX стагоддзя. Яе вершы сведчаць пра глыбокі ўнутраны свет аўтаркі, які спалучае яе шчырае пачуццё любові да Радзімы, сям'і і прыроды з вострым перажываннем гістарычных трагедый і асабістых страт. У яе творах асабістае і агульнанацыянальнае існуюць у неразрыўным адзінстве. Яе прыклад паказвае, як нават у складаных умовах можна заставацца верным беларускаму слову, развіваць нацыянальную культуру і служыць Радзіме не толькі на словах, але і на справе. Задача для даследчыкаў – вывучэнне і публікацыя поўнага збору яе вершаў. Бо менавіта ў рукапісах захоўваюцца тыя куткі яе душы, якія яна не заўсёды адкрывала шырокай публіцы.

Спіс выкарыстаных крыніц


1. Шматкова, І. Беларуская жаночая паэзія XX стагоддзя : вучэб.-метад. дапам. / І. І. Шматкова – Мінск : БДУ, 2023. – 199 с.

2. Верас, З. «Малы» нататнік / З. Верас // Літ. Музей М. Багдановіча. – Асн. Фонд. – КП 8144.

3. Верас, З. «Вялікі» нататнік / З. Верас // Літ. Музей М. Багдановіча. – Асн. Фонд. – КП 11235.

4. Верас, З. Выбраныя творы / Зоська Верас. – Мінск : Бел. Навука, 2015. – 572 с.

5. Зоська Верас // Бліскавіцы: анталогія беларускай жаночай паэзіі міжваеннага перыяду. – Мінск : Кнігазбор, 2017. – 448 с.